УДК 811.161.3:378.147

# ВЫКАРЫСТАННЕ МЕТОДЫКІ АКТЫЎНАГА НАВУЧАННЯ ПРЫ ЛІНГВІСТЫЧНАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ СТУДЭНТАЎ

**З.Я. Садоўская**
УА "Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт"
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Асноўная задача вышэйшай школы ў наш час – падрыхтоўка спецыяліста, здольнага самастойна ажыццяйляць прафесійную дзейнасць, павышаць свой кваліфікацыйны ўзровень і агульную культуру асобы.

Актыўныя метады навучання дапамагаюць студэнтам авалодаць не толькі ведамі, не толькі наборам карысных і неабходных навыкаў, але і ўменннем мысліць творча і крытычна, валодаць развітым гаварэннем, быць умелымі лідэрамі, упэўнена і матывавана падыходзіць да пастаўленых задач.

Да формаў арганізацыі вучэбнага працэсу ў вышэйшай школе адносяцца лекцыі, семінарскія і практычныя заняткі, самастойная работа студэнтаў і педагагічны кантроль. Выкарыстанне некаторых актыўных метадаў навучання праілюструю на прыкладзе лекцый, практычных заняткаў і форм кантролю.

1. У сучаснай вышэйшай школе даволі часта па-ранейшаму выкарыстоўваецца традыцыйная лекцыя, у час якой найбольшая актыўнасць праяўляецца выкладчыкам, які імкнецца перадаць студэнтам як мага больш інфармацыі, а задача слухачоў – напісанне канспекта. Адна з галоўных праблем такой лекцыі – адсутнасць часу для асэнсавання і абмеркавання інфармацыі, якая паступае ад выкладчыка. І для таго, каб актывізаваць вучэбна-пазнавальную дзейнасць студэнтаў, іх самастойную аўдыторную працу можна зрабіць выклад больш цікавым, выкарыстоўваючы лекцыі праблемнага характару, на якіх матэрыял падаецца як адказ на пастаўленую праблему. Выкладанне матэрыялу на праблемнай лекцыі адрозніваецца і тым, што лектар будуе сваю прамову ў выглядзе разважання, а гэта дае магчымасці студэнтам прымаць актыўны ўдзел у абмеркаванні праблемных пытанняў. З цікавасцю ўспрымаецца студэнтамі і лекцыя з працэдурнымі паўзамі. У час такіх лекцый чаргуецца актыўнасць лектара і навучэнцаў.

2. Асноўнай формай арганізацыі вучэбнага працэсу па беларускай мове з'яўляюцца практычныя заняткі, на якіх можна выкарыстоўваць розныя віды актыўных метадаў навучання.

Для таго, каб пазнаёміцца са студэнтамі, стварыць добразычлівую атмасферу, выявіць іх уменне вітацца, выхоўваць ветлівасць і чуласць, на першых практычных занятках я выкарыстоўваю такія актыўныя метады як “Прывітанне”, “Знаёмства”, “Камплімент”. Студэнтам прапаноўваецца прадумаць цікавае прывітанне. Яны павінны назваць сваё імя, гастранамічнае блюда і горад, якія пачынаюцца з першай літары імені (Напрыклад, “Мяне завуць Сяргей, блюда – салата, горад – Саратаў”, “Мяне завуць Раман, блюда – рыба, горад – Рыга”). Акрамя гэтага, кожны павінен сказаць камплімент другому.

Дыскусія таксама з’яўляецца адным з актыўных метадаў навучання, які я часта выкарыстоўваю на занятках. Дыскусія пашырае ўяўленні студэнтаў пра прадмет абмеркавання, дае магчымасці даказаць сваю пазіцыю і замацаваць матэрыял. Заўсёды цікава праходзяць заняткі з выкарыстаннем гэтага метаду ў час разгляду пытання “Гіпотэзы паходжання мовы”. Студэнты( па свайму жаданню) дзеляцца на групы. Кожная з груп даказвае, якая з гіпотэз, на іх думку, з’яўляецца найбольш праўдападобнай. Пра дыскусію па гэтаму пытанню аб’яўляецца на папярэдніх занятках, таму ў студэнтаў ёсць магчымасць пазнаёміцца з дадатковай літаратурай і зрабіць свае доказы больш аргументаванымі.

На практычных занятках па “Фанетычнай інтэрферэнцыі” студэнты працуюць у дыялагічных парах. Ім прапаноўваюцца розныя віды практыкаванняў, пры выкананні якіх яскрава адчуваецца і ўсведамляецца спецыфіка беларускага і рускага маўлення. Для больш нагляднага паказу фанетычных разыходжанняў у рускай і беларускай мовах адна з дыялагічных пар зачытвае выкананыя практыкаванні (па маёй просьбе, студэнт з ярка выражаным “дзеканнем”, “цеканнем”, фрыкатыўным “г” чытае словы ці тэкст на рускай мове ), а ўсе астатнія студэнты аб’яўляюцца аналітыкамі, якія павінны прааналізаваць правільнае вымаўленне гукаў.

3. Вядома, што для многіх студэнтаў апытванне, кантрольны залік – гэта стрэс, які запавольвае рэакцыю і не дае магчымасці сканцэнтравацца, успомніць і ясна, зразумела раскрыць пытанне. Укараненне ў адукацыю актыўных метадаў навучання дае магчымасць вырашыць і гэту праблему. На занятках па кантролю ведаў можна выкарыстоўваць тэсты (з гэтай формай кантролю сённяшнія студэнты добра знаёмы); узаемаправерку, у час якой усе студэнты дзеляцца на выкладчыкаў і навучэнцаў; самаацэнку, якае дазваляе студэнтам выявіць узровень сваёй падрыхтоўкі і зрабіць вывад аб гатоўнасці да заліку.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Рэзюмэ

Актыўныя метады навучання дапамагаюць сфарміраваць у студэнтаў навыкі ажыццяўлення арганізацыйнай, камунікатыўнай, уласна лінгвістычнай і прафесійнай дзейнасці.

Summary

Active methods of teaching help form students' skills of organizational communicative, linguistic proper and professional activities.

УДК 008:003

# О НЕКОТОРЫХ СЕМИОТИЧЕСКИХ АСПЕКТАХ ИГРЫ (ПО РАБОТАМ Ю.М. ЛОТМАНА)

**И.В. Середа**

УО «Гродненский государственный аграрный университет»
г. Гродно, Республика Беларусь

Игра – одно из ключевых понятий современной культурологии. Традиция рассматривать явления духовной культуры сквозь призму игры обладает более чем почтенным авторитетом и весьма древним происхождением. Феномен игры выступал в качестве объекта анализа и в классической (Кант, Шиллер) и в неклассической (Хейзинга, Финк, Ортега-и-Гассет, Гадамер, Хайдеггер, Сартр) и в постклассической (Барт, Деррида, Фуко, Делез, Гваттари) философской традиции. Следует отметить, что в широкий научный обиход понятие игры вошло лишь в XX веке, в значительной степени благодаря классической работе Й. Хейзинги «Homo Ludens» (1938). Современный же интерес к проблеме игрового элемента в культуре обусловлен характерным для гуманитарной мысли стремлением выявить глубинные дорефлексивные основания человеческого существования, связанные с присущим лишь человеку способом переживания реальности.

Сквозь призму семиотического подхода к изучению культуры феномен игры неоднократно рассматривался в работах главы Тартуско-Московской семиотической школы Ю.М. Лотмана. Можно выделить ряд аспектов, в рамках которых он анализирует этот феномен.

В первую очередь следует отметить, что игра выступает у Лотмана в качестве «моделирующей деятельности» или «особого типа модели действительности», которая «воспроизводит те или иные ее стороны, переводя их на язык своих правил» [1, с. 71; 2, с. 389–390]. Так, в контексте научно-познавательной модели действительности в сфере поведения практическая деятельность и «работа с моделью» резко



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ